# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ – АНАМАСТЫКА







Міжнародная навуковая канферэнцыя «Рэгіянальная анамастыка: праблемы і перспектывы даследавання» ў другі раз сабрала ў гасцінных сценах нашага ўніверсітэта вучоных-філолагаў з краін бліжняга і дальняга замежжа (Расія, Польшча, Украіна, Францыя, Канада, Кітай, ЗША), а таксама вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і вядучых навучальных устаноў нашай рэспублікі. Заснавальнікамі гэтага форуму выступілі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў, Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава, Смаленскі дзяржаўны ўніверсітэт, Анамастычная камісія Міжнароднага камітэта славістаў.

Канферэнцыя праводзіцца ў межах супрацоўніцтва са Смаленскім дзяржаўным ўніверсітэтам (па чарзе – у Смаленску і Віцебску). У сакавіку 2015 г. і красавіку 2017 г. яна адбылася на базе Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта, у лютым 2016 г. і сакавіку 2018 г. месцам сустрэчы вучоных-анамастаў стала наша ВНУ. Непасрэдным арганізатарам сёлетняга навуковага форуму была кафедра агульнага і рускага мовазнаўства пад кіраўніцтвам доктара філалагічных навук, прафесара Г.М. Мезенка.

Ганна Міхайлаўна з'яўляецца шырока вядомым даследчыкам анамастыкі ў нашым рэгіёне, лідарам Віцебскай анамастычнай школы.

Актуальнасць правядзення гэтай канферэнцыі, па словах прафесара, абумоўлена адсутнасцю ў беларусістыцы і русістыцы комплексных анамастычных і лінгвакультуралагічных даследаванняў онімаў розных рэгіёнаў. Нацыянальныя анамастыконы захоўваюць у сваёй памяці шырокія звесткі пра асаблівасці арганізацыі, эканамічнае развіццё, культуру, этнаграфію супольнасцей, для абслугоўвання якіх яны ўтвараліся. Усебаковы аналіз узаемнага ўплыву дзвюх моў і культур дазваляе атрымаць важныя эксперыментальныя дадзеныя пра ролю беларускага і рускага этнасаў у стварэнні моўных і культурных каштоўнасцей вывучаемых рэгіёнаў. Гэта стане важным укладам у развіццё асноўных пытанняў анамастычнай кампаратывістыкі.

Розныя аспекты анамастыкі былі абмеркаваны на пленарным пасяджэнні і шасці секцыях. Іх тэматыка ўключала такія накірункі, як тэорыя і метадалогія анамастычных даследаванняў, сучасныя праблемы тапанімікі, актуальныя пытанні антрапанімікі, літаратурная анамастыка, анамастычная перыферыя, анамастычна-педагагічныя праблемы ў адукацыйнай прасторы. Ужо на пленарным пасяджэнні ўсе ўдзельнікі канферэнцыі атрымалі зборнік навуковых артыкулаў пад рэдакцыяй Г.М. Мезенка. Па выніках правядзення папярэдніх канферэнцый таксама апублікаваны зборнікі матэрыялаў, уключаныя ў сістэму РІНЦ.

Усе госці маглі пазнаёміцца з музеямі ўніверсітэта (народным літаратурным музеем і музеем дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мастацка-графічнага факультэта) і наведаць музей-сядзібу І.Я. Рэпіна ў Здраўнёва.

**Фёдар ШКІРАНДА.**

**На здымках:** падчас правядзення канферэнцыі.

**Фота А. ДУБРОЎСКАЙ.**

**P.S.** На пачатку канферэнцыі прысутныя павіншавалі Г.М. Мезенка з юбілейным днём нараджэння. Дэкан філалагічнага факультэта С.У. Нікалаенка ўручыў спецвыпуск зборніка навуковых прац «Вучоныя запіскі УА "ВДУ імя П.М. Машэрава"»; ад імя НАН Беларусі да Ганны Міхайлаўны звярнуліся дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі І.Л. Капылоў і першы намеснік дырэктара па навуковай рабоце, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар А.А. Лукашанец; колькі добрых слоў у адрас юбіляра сказалі госці з Масквы, Санкт-Пецярбурга і Смаленска.